Беларусь.info

№80 23/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Беларусь разьлічыцца за газ сваімі прадпрыемствамі?** Сёньня пад час сустрэчы кіраўніка “Газпрома” Аляксея Мілера і беларускага віцэ-прэм’ера Уладзімера Сямашкі было вырашана скласьці сьпіс прадпрыемстваў Беларусі, якія ўяўляюць цікавасьць для расейскага газавага манапаліста. Як заявіў намесьнік кіраўніка "Газпрома" Аляксандар Разанаў, “Газпром” зацікаўлены ў набыцьці беларускіх нафтахімічных прадпрыемстваў, якімі афіцыйны Менск мог бы кампэнсаваць падвышаны кошт газу ў 2007 годзе. У прыватнасьці, была выказаная цікавасьць да Мазырскага нафтаперапрацоўчага заводу.

**Беларусы правялі ў Маскве пікет каля амбасады Літвы.** Акцыю арганізаваў пралукашэнкаўскі Савет Рэгіянальнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Масквы». Удзельнікі пікету пратэставалі супраць планаў кіраўніцтва Літвы пабудаваць каля літоўска-беларускай мяжы сховішча адпрацаванага ядзернага паліва Ігналінскай атамнай электрастанцыі. Акцыя скончылася передачай у амбасаду звароту да літоўскага ўраду з заклікам не дапусціць новай экалагічнай катастрофы, якая можа пагражаць усяму балтыйскаму рэгіёну.

**Сёння Вярхоўны суд Беларусі распачаў разгляд пазову Мінюсту аб прыпыненні дзейнасці Беларускага Хельсінскага камітэту.** Органы юстыцыі абнавачваюць праваабарончую арганізацыю ў парушэнні заканадаўства і ўласнага статуту. Чыноўнікі сцвярджаюць, што БХК на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у 2004 годзе пад выглядам сваіх сябраў накіраваў на выбарчыя ўчасткі асобаў, якія не ўваходзілі ў аб’яднанне. Акрамя таго, парушэннем лічыцца той факт, што арганізацыйныя структуры камітэту працяглы час выкарыстоўвалі ў якасці юрыдычных адрасоў жылыя памяшканні.

**Літоўскія ўзброеныя сілы распачалі расследаванне па факце парушэння беларускім вайсковым шрубалётам літоўскай мяжы.** Аб гэтым паведамляюць медыі нашай паўночнай суседкі. Беларускі бок абвяргае абвінавачванні і заяўляе, што парушэння мяжы не было. Паводле інфармацыі газеты Lietuvos Rytas, здарэнне адбылося ўвечары ў панядзелак, калі беларускі вайсковы шрубалёт, нібыта, заляцеў на некалькі кіламетраў углыб літоўскай тэрыторыі ў Лоздзійскім раёне. Неўзабаве ён вярнуўся ў Беларусь, але пасля зноў заляцеў у Літву. Літоўскі бок сцвярджае, што ў тым раёне цяжка не заўважыць дзяржаўную мяжу, бо яна праходзіць па Нёману.

# Факты

**Работнікі “Беларуськалію” пачалі атрымліваць меншыя заробкі.** Заробкі меншаюць, бо работнікаў пераводзяць на дзьве траціны тарыфу — а гэта ў тры разы меней за ранейшыя грошы. Таксама некаторых выпраўляюць у няплянавыя адпачынкі. Цяпер здабыча калійнай руды адбываецца ў трох з чатырох руднікоў, але прадукцыя не выходзіць за межы прадпрыемства — яе ніхто не купляе. Як ставяцца работнікі “Беларуськалію” і іншыя салігорцы да сытуацыі й што думаюць пра будучыню?

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org